- ПравПравіПравілы
- Тэксты

- Заданне
- Адказ
- Схемы

# Паміж сэнсавымі часткамі ў складаных сказах з рознымі спосабамі сувязі частак ставіцца:

1. Двукроп'е
2. Коска
3. Коска не ставКоска не ставіКоска не ставіцца

Коска ставіцца тады, калі пасля даданай часткі няма другой часткі парнага падпарадкавальнага злучніка ( то, дык)

*Праўда, разам з травой снег засыпаў і сляды,* ***і, калі*** *гэтая замець не перастане да ночы, слядоў, няпэўна, можна будзе не баяцца.*

***Параўнайце:*** *Праўда, разам з травой снег засыпаў і сляды,* ***і калі*** *гэтая замець не перастане да ночы,* ***дык*** *слядоў, няпэўна, можна будзе не баяцца.*




У апошнім выпадку коска паміж злучнікамі і і калі не ставіцца, таму што пасля даданай часткі ўмовы *калі гэтая замець не перастане да ночы* стаіць дык – другая частка парнага падпарадкавальнага злучніка калі…дык

Двукроп’е ставіцца паміж першай і другой сэнсавымі часткамі у тым выпадку, калі часткі звязаны бяззлучнікавай сувяззю і калі другая сэнсавая частка раскрывае сэнс першай часткі або абазначае прычыну дзеяння, пра якое гаворыцца у першай сэнсавай частцы.

*Ён ведаў: мінулыя пакаленні толькі тады паміраюць у гісторыі, калі у чалавецтва не застаецца іх памяці, іх мастацтва.*



Коска не ставіцца паміж дзвюма часткамі, звязанымі пры дапамозе спалучальных злучнікаў і, ды, калі трэцяя частка з’яуляецца агульнай для іх.

*Ужо сонца праглядвала праз вершаліны хвой і пачынала адчувацца гарачыня летняга дня, калі дзеці падышлі да балота.*



# Заданне

- Расстаўце знакі прыпынку ў сказах з наступнага лайда і праверце сябе (слайд пасля задання)

- Недзе далека на ўсходзе пачынае прачынацца сонца і ўсе вакол заліваецца ружовымі фарбамі чуецца ўжо першая песня ранішняга жаўрука ды даносіцца аднекуль ціхае сіпенне нейкай жывеліны здаецца сабакі. Высока ўзыходзіць сонца і луг паўстае ва ўсей сваей прыгажосці пераліваюцца ўсімі колерамі кветкі звіняць пчолы і невялічкія залатыя рыбкі мільгацяць у возеры што стаіць ля лугу.
- Але на небе пачынаюць збірацца хмары і калі мы не пасляшаемся то пападзем якраз пад дождж. Палахліва замітусіліся пчолы і матылькі а хутка зусім зніклі схаваліся і мы пад кронай старога дуба.
- І тут пайшоў дождж вялікія  буйныя кроплі падаюць на зямлю б’юцца аб роўную паверхню возера і на ей з’яўляюцца бурбалкі. Калі дождж праходзіць усе па-ранейшаму ціха толькі ў возеры кіпіць жыцце. А над лугам раскінулася вяселка прыгожая з такімі яркімі густымі фарбамі што па ей здаецца можна прайсці. Вось зноў з-за хмар паказалася сонца і яго промні ласкава саграваюць кветкі якія смеючыся раскрываюць свае пялесткі.

- Недзе далека на ўсходзе пачынае прачынацца сонца, і ўсе вакол заліваецца ружовымі фарбамі; чуецца ўжо першая песня ранішняга жаўрука, ды даносіцца аднекуль ціхае сіпенне нейкай жывеліны, здаецца, сабакі. Высока ўзыходзіць сонца, і луг паўстае ва ўсей сваей прыгажосці: пераліваюцца ўсімі колерамі кветкі, звіняць пчолы, і невялічкія залатыя рыбкі мільгацяць у возеры, што стаіць ля лугу.
- Але на небе пачынаюць збірацца хмары, і калі мы не паспяшаемся, то пападзем якраз пад дождж. Палахліва замітусіліся пчолы і матылькі, а хутка зусім зніклі; схаваліся і мы пад кронай старога дуба.
- І тут пайшоў дождж: вялікія, буйныя кроплі падаюць на зямлю, б'юцца аб роўную паверхню возера, і на ей з'яўляюцца бурбалкі. Калі дождж праходзіць, усе па-ранейшаму ціха, толькі ў возеры кіпіць жыцце. А над лугам раскінулася вяселка, прыгожая, з такімі яркімі густымі фарбамі, што па ей, здаецца, можна прайсці. Вось зноў з-за хмар паказалася сонца, і яго промні ласкава саграваюць кветкі, якія, смеючыся, раскрываюць свае пялесткі.


I
II
Калі
Калі


I
II
і
якія
якія


I
II
і
ды


I
II
і